**Грыгаровіч, В.** Уздоўж ракі Мургаб / В. Грыгаровіч // Родныя вытокі. — 1996. — 19 чэрв. — С. 4.

## УЗДОЎЖ РАКІ МУРГАБ

*У лютым афганцы адзначылі важную для сябе дату – Дзень вываду савецкіх войск з Афганістана. 7 гадоў назад спынілася яшчэ адна страшная вайна, якая бязлітасна ўварвалася ў тысячы сем'яў. Лёс распарадзіўся так, каб і я стаў удзельнікам гэтай вельмі супярэчнай і нікому непатрэбнай вайны. Мы пакінулі Афган, але ен жыве ў нашых думках і нашых ранах, у сэрцах заўчасна пасівеўшых бацькоў. Я вам прапаную адзін эпізод сваёй службы, у час якой прыходзілася вазіць у Афганістан «безвозмездную» (я знарок ужыў слова на рускай мове, бо, на мой погляд, на беларускай яно не вельмі гучыць) дапамогу. А ці такая ўжо яна была «безвозмездная» для нашых салдат і афіцэраў? Мяркуйце самі.*

...Надрываючы карданы, ішлі гружаныя «Уралы» ўздоўж ракі Мургаб на Кілай-Нау. Пасля вясенняй паводкі рака была ціхая і бяскрыўдная, але берагі зрабіла балоцістымі, і ад вадзіл цяпер патрабавалася вялікае майстэрства: першымі і праз кожныя пяць машын ішлі «БМПухі», якія сваімі гусеніцамі бязлітасна разрывалі і так кволы бераг. Пасля іх па адным і тым жа следзе магло прайсці машыны тры, а наступным патрэбна было выбіраць новую каляіну. А дзе яе выбіраць? Злева – вада і яшчэ горшае пекла, а справа – непрыступныя сопкі. Калона рухалася вельмі марудна, і думкі міжволі звярталіся да толькі што пережытых падзей.

Чарговая калона ў Афган пачалася як звычайна: на станцыі Тахта-Базар загрузіліся пшаніцай, бензінам, вугалем і іншымі рэчамі – усё гэта складала «безвозмездную» дапамогу. Раніцай перасеклі туркмена-афганскую граніцу і адправіліся выконваць свой інтэрнацыянальны доўг.

Для Дзімкі Воблікава гэта калона была ўжо не першая, але ён ніяк не мог пазбавіцца душэўнага трымцення, калі праязджалі граніцу і былі бачны пагранічныя слупы, нашы і афганскія. Не, гэта быў не страх, а хутчэй за ўсё глыбокае асэнсаванне таго, што вось за гэтым пагранічным знакам застаецца нешта дарагое сэрцу, нешта блізкае і вельмі роднае. Хоць гэта была Туркменія, а не мілая Беларусь (дарэчы, ён толькі тут гэта зразумеў), усё роўна вусны падсвядома шапталі словы паэмы Якуба Коласа:

«Мой родны кут,
Як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай ...»

А далей не памятаў. Тады звяртаўся да Янкі Купалы:

«Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына.
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай ...»

І ўсё – далей таксама не ведаў. А так хацелася праспяваць іх! Воблікаў уголас праклінаў сябе за тое, што не вывучыў гэтыя два цудоўныя вершы.

Калі вучыўся ў школе, то не звяртаў увагі на высокія словы пра любоў да роднага краю.

А тут гэта пачуццё так абвастрылася, што нейкая чужая Туркменія стала асацыіравацца з родным краем, хаця калі ўзяць прыроду, то голым туркменскім сопкам вельмі далёка да нашай зялёнай травіцы і беластволых прыгажунь. Праўда, раз у год і Туркменія бывае казачна чароўнай. Гэта адбываецца ранняй вясной, калі сопкі і даліны пакрываюцца зялёнай траўкай, а на яе фоне з'яўляецца незлічоная колькасць чырвоных цюльпанаў. Безумоўна, такой прыгажосці ў нас не сустрэнеш, але яна хутка праходзіць, і застаюцца голы пясок ды вярблюджыя калючкі.

Пры пад'ездзе да кішлака думкі пайшлі ў другім накірунку. На ляплёнкі, у якіх жылі афганцы, было глядзець вельмі дзіка. Душу агарнуў жаль да гэтых бедных людзей, і падумалася: «Можа, і добра, што вязём мы ім хлеб». Але раптам перад вачамі мільганула нейкая чорная пляма, і адначасова ў твар палыхнула нечым вострым, у грудзях адчуў тупы боль. Праз імгненне Воблікаў убачыў, што выбіта лабавое шкло, на каленях ляжаў увесісты паўцагелак, а з-за дувала пацаны і пажылыя афганцы шпурлялі розным ка-меннем па машынах. Дзімка вылаяўся самым моцным матам, правай рукой кіраваў машынай, а левай узяў аўтамат і даў чаргу ў паветра. Афганцы кінуліся ўрассыпную. Воблікаў быў хлопец гарачы, а таму спачуванне змянілася злосцю:

– Вам, гады, хлеб вязём, а вы каменнем! – Але крыху астыўшы, падумаў: «Лепш каменнем, чым кулямі». І як заўрок – спераду пачулася перастрэлка. Калона не спынілася. Хутка зноў стала ціха, толькі фыркалі дызелі, і стаялі клубы пылу, за якімі не было відаць машын, і прыходзілася ехаць услед за асядаючым пылам, не расцягваючы калону, бо гэта было вельмі небяспечна.

Праехаўшы кішлак, калона спынілася. Воблікаў даведаўся, што з аднаго дома пачалі страляць па БМП, на якой знаходзіўся дэсант. У адказ доўгія чэргі з «калашнікаў» паслалі прапаршчык і старшы лейтэнант. Гэта, безумоўна, не была загадзя падрыхтаваная засада, а хутчэй за ўсё нейкі азлобіўшыся афганец, перайшоўшы ад камення да аўтамата, выказаў свой пратэст. Дзякуй Богу, на гэты раз абышлося без крыві.

Кожны раз, калі Дзіма ехаў на сваім бензавозе адзін, яму хацелася спяваць, і ён спяваў, спяваў розныя песні. Сёння з языка не сыходзіла ротная песня:

> «А помирать нам рановато,
> Есть у нас ещё дома дела».

Наперадзе ехаў на дызельным «Урале» зямляк Толя Савіцкі. Каляіна была размешана ўшчэнт. На павароце Мургаба Толя ледзь выскраб. Воблікаў уголас папрасіў дапамогі ў Бога і, узяўшы як мага большы разгон, вырваў машыну з гэтага праклятага месіва, у думках адзначыўшы, што тут нехта забулёніцца, Дзімка паглядзеў у люстэрка і ўбачыў, што дзве машыны за ім прарвалі.

Праехаўшы кіламетры са тры, калона спынілася. Хутка да Воблікава падбег лейтэнант Ісаеў:

– Забуксаваў Ахмадулін. Ён гружаны бензінам, ніяк не можам яго вырваць. Злівай на зямлю сваю салярку, едзь назад і адкачвай сабе яго бензін.

Гэта азначала, што частка калоны была ў «пробцы»: ні ўзад, ні ўперад. У афганскіх здрадлівых сопках такое становішча было раўназначнае смяротнаму прысуду.

Воблікаў на ўсіх парах памчаў да хваста калоны. Афган хутка прывучыў быць пільным. І хоць здавалася, што Дзімка сочыць толькі за дарогай, але ніводная сопка не была па-за яго ўвагай. Здаецца, усё нармальна, нікога няма ў гэтай бяздыханай пустэчы, толькі непахісна стаяць пад пякельным сонцам кусты вярблюджай калючкі. Але на адной з сопак вопытнае вока ўлавіла дзве постаці. Воблікаў пільна ўзіраўся і, не знайшоўшы нічога падазронага, адзначыў пра сябе, што гэта, напэўна, чабаны.

А вось і калона. Бензавоз так зарыўся, што сядзеў у бурдзе на раме. Каля яго ўжо валяўся адарваны, пакурожаны бампер. Вакол машын бегаў капітан Памазухін, махаў рукамі, аддаючы ўказанні. Усе баяліся, каб не наскочылі «духі».

Адкачаўшы бензін, Воблікаў паехаў да галавы калоны. Вочы самі імкнуліся туды, дзе заўважыў двух афганцаў. Іх не было. Дзімка не паспеў адвесці ад сопкі галаву, як страшэнны выбух скалануў машыну...

У прытомнасць прывёў да болю знаёмы свіст і трэск «вяртушак» і нечы роспачны крык:

– Асцярожна, братцы, ён без ног!..

**В. Грыгаровіч, настаўнік Заборцаўскай школы**